**Дзень маці і конкурс маладых спецыялістаў**

Урачысты і святочны настрой адчуваўся ўжо ў фае, дзе вока радавалі разнастайныя тэматычныя выставы: карцін Дануте Пілібене, творчых работ работнікаў Цэнтральнай раённай бібліятэкі, малюнкаў выхаванцаў Астравецкай ДШМ “Мама”. Члены райкама БРСМ і раённага аб’яднання прафсаюзаў раздавалі прысутным прыгожыя сэрцайкі – як сімвал вялікай любові да сваіх матуль.



Падчас урачыстага мерапрыемства ўсіх маці павіншаваў намеснік старшыні райвыканкама Павел Віктаравіч Мілешка, які адзначыў, што мама – галоўны і самы дарагі чалавек у жыцці кожнага, яна надзейна захоўвае шчасце свайго дзіцяці і яе галоўная мэта і жаданне вырасціць дастойнага чалавека і грамадзяніна сваёй краіны.

Да віншаванняў далучыўся і благачынны Астравецкага благачыння, пратаіерэй Георгій Савіцкі. Ен зазначыў: “Адметна, што Дзень маці прыпадае на вялікае царкоўнае свята Дня Пакрова Божай Маці. Няхай яна, як і кожная маці, абараняе ўсіх ад зла і бед. Любіце і шануйце сваіх матуль”.

Міра і дабра ў кожную сям’ю, любові і шчасця ўсім жанчынам, якія носяць ганаровае званне маці, пажадала начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наталля Уладзіміраўна Сянюць. І яна ж аб’явіла аб пачатку конкурсу сярод маладых спецыялістаў “Творчасць без межаў”.

Пятнаццаць канкурсантаў з розных сфер дзейнасці дэманстравалі самыя разнастайныя таленты. Многія нумары прысвячаліся менавіта Дню маці. Перавага была аддадзена песні: спявалі не толькі работнікі культуры,

але настаўнікі і ўрачы, майстар лясной гаспадаркі і прадстаўнікі сельгаскааператыва – і варта адзначыць, што некаторыя аматары-самавучкі нічым не саступалі прафесіяналам. Не абышлося і без танцаў: нікога не пакінуў абыякавым філасофска-пранікнёны нумар маладога харэографа Цэнтра культуры, а вясёлая і няўрымслівая шасцёрка выратавальнікаў прадэманстравала ўменне не толькі тушыць пажары, але і "запальваць" у дыскатэчным рытме.

Знайшліся сярод моладзі і віртуозы ігры на музычных інструментах. "Венгерка" на цымбалах выклікала дружныя апладысменты, а непаўторнае выкананне задорных матываў на духавых інструментах ад квартэта з дзіцячай школы мастацтваў прымушала яшчэ і прытанцоўваць. Былі сярод маладых канкурсантаў і паэты: супрацоўніца СВК "Гервяты" прачытала свой верш, прысвечаны маме, – атрымалася чулліва і шчыра.

У выніку журы ацаніла творчасць і старанне ўдзельнікаў і вынесла свой прысуд. Трэцяе месца заняла харэограф Астравецкага Цэнтра культуры і народнай творчасці Маргарыта Яцэвіч, другое – педагог дзіцячай школы мастацтваў Дзіяна Фанван, а пераможцай конкурсу стала супрацоўніца раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Вераніка Ганчарова. Усе яны былі ўзнагароджаны дыпломамі і атрымалі падарункі.